# Вывучэнне сінтаксічных адзінак на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах

*Камянчук Валерыя Вадзімаўна*

УА «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Сучасны ўзровень развіцця грамадства патрабуе далейшага ўдасканалення ўсёй сістэмы народнай адукацыі. Вельмі важным звяном у гэтай сістэме з'яўляецца навучанне роднай мове, з дапамогай якой вучні пачатковых класаў фарміруюць і выражаюць свае думкі, а таксама забяспечваюцца выхаванне, навучанне і моўныя зносіны ў вучнёўскім калектыве, захаванне і перадача вопыту і ведаў. Школьнае навучанне прадмета "Беларуская мова" арыентавалася ў большай ступені на веды. Практычнае ж авалодванне мовай, фарміраванне нацыянальна свядомай асобы, яе актыўнае інтэлектуальнае развіццё – усё гэта адыходзіла на другі план. Нельга не заўважыць значных пераменаў: у сучасным жыцці змяніліся прыярытэты, што праяўляецца і ў каштоўнасцях грамадства, і ў развіцці і дасягненнях навукі, і ў напрамках навуковых даследаванняў. У сувязі з гэтым змяніліся і адукацыйныя мэты, у прыватнасці, задачы і спосабы навучання вучняў.

У апошняе дзесяцігоддзе выразна прасочваецца тэндэнцыя разглядаць мову і навучанне моўным дысцыплінам праз маўленчую дзейнасць, таму асноўным напрамкам школьнага курса беларускай мовы ў пачатковых класах павінен стаць камунікатыўна-прагматычны накірунак.

Сёння ствараецца новая канцэпцыя моўнай адукацыі, асноўным напрамкам якой у выкладанні беларускай мовы павінен стаць перагляд школьнага курса. Цяпер мова разглядаецца ў якасці механізму фарміравання асобы чалавека, яго светаўспрымання і паводзінаў, а таксама як сродак практычнага авалодвання мовай. Калі раней пры навучанні беларускай мове асноўная ўвага ўдзялялася лінгвацэнтрычнаму падыходу, то цяпер гэты аспект адыходзіць на задні план (у цэнтры стаіць антрапацэнтрычнасць – чалавек, яго быццё). Мова – дом быцця, у гэтым доме пражывае чалавек. Гаворачы пра асноўныя задачы навучання мове, трэба мець на ўвазе, што ўсе яны заўсёды ставіліся перад школай, аднак вырашалася пераважна адна адукацыйная.

Адукацыйнае і выхаваўчае значэнне прадмета "Беларуская мова" у пачатковых класах павінна вызначацца сацыяльнымі функцыямі беларускай мовы, якая з'яўляецца сродкам зносін і ўздзеяння, пазнання рэчаіснасці, захавання і засваення ведаў, далучэння вучняў да нацыянальнай культуры, крыніцай мастацкай літаратуры як слоўнага

мастацтва. Аднак данесці гэта разуменне да вучняў пачатковых класаў можна толькі пры дапамозе тых прынцыпаў, сродкаў, метадаў і прыёмаў навучання, адэкватных сучасным навуковым дасягненням.

У школьным курсе беларускай мовы вывучаюцца ўсе яе ўзроўні. У яго ўключаны самыя элементарныя, пачатковыя паняцці, якія апісваюць гэтыя (гука, слова, словазлучэння, сказа) і функцыянавання іх у маўленні. У адпаведнасці з гэтым пры навучанні беларускай мове ў пачатковых класах павінны ставіцца наступныя прыватныя, спецыяльныя мэты;

–вывучэнне асноўных асаблівасцей адзінак мовы;

–азнаямленне з іх функцыянаваннем у маўленні;

–фарміраванне ў вучняў пачатковых класаў вучэбна-моўных уменняў.

Марфалогія і сінтаксіс, як вядома, з'яўляюцца дзвюма раўнапраўнымі, самастойнымі часткамі граматыкі. Сінтаксіс – раздзел мовы, у якім прадстаўлены правілы граматычнага афармлення словазлучэння і сказа. У сінтаксісе выдзяляюцца тры часткі: 1) вучэнне пра словазлучэнне; 2) вучэнне пра сказ (просты і складаны); 3) вучэнне пра тэкст. У пачатковай школе закладваюцца ўсе асновы для паспяховага засваення марфалогіі на сінтаксічнай аснове, а таксама для навучання вучняў звязнай мове. (Сістэматычнае вывучэнне сінтаксісу ажыццяўляецца ў V–XI класах).

Галоўнае паняцце сінтаксісу – гэта тыпы сувязі кампанентаў у сінтаксічных адзінках – словазлучэнні і сказе. Вылучаюць два асноўныя тыпы сувязі – злучэнне і падпарадкаванне: бярозы і сосны, прыгожыя кветкі, чытаць кнігу; Прыйшла восень, і птушкі адляцелі ў вырай. Хлопчык прынёс кнігу, якую купіў яму бацька.

У пачатковым курсе вывучэння сінтаксісу разглядаюцца асноўныя сінтаксічныя катэгорыі і паняцці: сказ, яго лексічны склад і яго мадэляванне; самыя простыя тыпы сказаў; галоўныя члены сказа; даданыя члены сказа; вылучэнне словазлучэння са сказа; вылучэнне сказа з тэксту; складанне сказаў і іх запіс і абазначэння пачатку і канца сказа, інтанацыі; выяўленне сувязі частак сказа; вылучэнне асобных сказаў у тэксце і інш.

Вывучэнне сінтаксічных адзінак (словаформа, словазлучэнне, сказ, тэкст) грунтуецца на засваенні вучнямі функцый гэтых адзінак, іх значэння і будовы. Фарміраванне вучэбна-моўных уменняў і навыкаў садзейнічае замацаванню атрыманых лінгвістычных ведаў.

Пры вывучэнні сінтаксічных адзінак (паняццяў) неабходна вырашыць наступныя задачы: 1) фарміраваць у вучняў навуковыя ўяўленні пра сінтаксічныя з'явы беларускай літаратурнай мовы; 2) садзейнічаць засваенню вучнямі адпаведных сінтаксічных тэрмінаў і фармуліровак панняцяў (дэфініцый), якія ў школьнай практыцы называюць правіламі; 3) вучыць дзяцей асэнсавана выкарыстоўваць атрыманыя сінтаксічныя веды пры выражэнні сваіх думак ў выглядзе асобных сказаў (простых і

складаных) ці звязаных тэкстаў у вуснай і пісьмовай форме; 4) сумяшчаць работу па граматыцы з развіццём мысленчых, моўных і маўленчых магчымасцей вучняў; 5) фарміраваць і развіваць у школьнікаў цікавасць да граматычнага ладу мовы.

Граматычныя (сінтаксічныя) катэгорыі характарызуюцца вельмі высокай ступенню абагульненасці, абстрактнасці. Галоўным аб'ектам сінтаксічнага вывучэння з'яўляюцца працэсы і вынікі называння (намінацыі) сітуацый у мэтах камунікацыі паміж носьбітамі мовы. Вучням пачатковых класаў, як вядома, у большай ступені характэрна канкрэтнасць, выразнасць, нагляднасць. У сувязі з гэтым, у школьным навучанні назіраецца супярэчнасць паміж спецыфічнасцю вывучаемых граматычных катэгорый і спецыфічнасцю дзіцячага маўлення.

Традыцыйна курс граматыкі пачынаецца з сінтаксічнай тэмы "Сказ". У сучасных камунікатыўна накіраваных курсах асобныя аўтары ўводзяць такую мадэль: гутарка – маўленне – тэкст – сказ – слова (словаформа) – гук (на пісьме – літара). Такі падыход з'яўляецца лагічным, ён функцыянальны і адразу раскрывае перад вучнямі сістэму мовы.

Сінтаксічныя веды і ўменні садзейнічаюць разуменню тэксту пры яго чытанні і развіццю ўласнага маўлення – вуснай і асабліва пісьмовай. Бесперапыннасць сінтаксічнай работы вучняў забяспечваецца ў двух варыянтах: аналітычным (выдзяленне сказаў з тэксту, іх аналіз) і сінтэтычным (складанне словазлучэнняў і сказаў, іх інтанаванне, запіс, уключэнне ў тэкст). Крытэрыем патрэбнасці ў сінтаксісе служыць узровень практычных уменняў школьнікаў: у сваёй мове (маўленні) яны вольна (хоць і не заўсёды правільна) будуюць і складаныя сказы, і прамую мову, ускладненыя сінтаксічныя канструкцыі: аднародныя члены, адасобленыя члены, звароткі і інш.

Толькі з засваеннем сінтаксічнага ладу беларускай мовы можна гаварыць, у цэлым, пра засваенне беларускай мовы.